# ІМЁНЫ БОГА: ЗАГАДКА АДНАГО ІМЯ

**К. С. Калабук**
*БДПУ (Мінск)*
*Навук. кіраўн. – Н. П. Лобань, канд. філалаг. навук, дац.*

**Анатацыя.** Асноўная мэта артыкула – прааналізаваць паходжанне і сэнсавае напаўненне аднаго загадкавага імені Бога, а таксама звярнуць увагу на іншыя імёны (Іегова, Сутны, Эль, Элаах, Элахім, Аданай, Яхве).

**Ключавыя словы:** імёны Бога (тэонімы); тэтраграматон, або тэтраграма; Іегова; Сутны; Эль; Элаах; Элахім; Аданай; Яхве.

Ва ўсіх народаў свету да імёнаў чалавека ставіліся асабліва, шанавалі сакральны сэнс імя. Старазапаветнае разуменне сэнсу і значэння імя карэнным чынам адрозніваецца ад сучаснага ўжывання імёнаў. У Старым Запавеце да імя ставіліся не проста як да апазнавальнай назвы, але і як да таямнічага знака, які паказвае на асноватворныя характарыстыкі яго носьбіта, знаходзіцца з ім у прамой сувязі.

Імя ўспрымаецца ў Старым Запавеце як поўны і сапраўдны вобраз названага прадмета або названай асобы. У Бібліі імя мае не адцягнены або тэарэтычны, а жыццёва-практычны характар: значэнне імені не славеснае, а сапраўднае. На мове Бібліі імя – не проста ўмоўнае пазначэнне той ці іншай асобы або прадмета, яно паказвае на асноўныя характарыстыкі свайго носьбіта, уяўляе яго глыбінную сутнасць. Акрамя таго, імя вызначае месца, якое яго носьбіт павінен займаць у свеце. Імя таямнічым чынам звязана з душой: калі імя прамаўляюць, яно ўзносіцца да душы свайго носьбіта. Старазапаветнае ўяўленне пра імя прадугледжвае яго не столькі як набор гукаў або літар для адрознення аднаго чалавека ад іншага, колькі яго сувязь з самім чалавекам. Даведацца чыё-небудзь імя – гэта значыць увайсці ў сувязь з носьбітам імя, спазнаць яго ўнутраную сутнасць. Чалавек у Старым Запавеце ўспрымаецца па прынцыпе: якое імя ў яго, такі і ён.

Але што ж да імя Бога? Колькі імёнаў у Бога? Адно ці больш? Па падліках даследчыкаў, налічваецца звыш 55 варыянтаў імёнаў Бога (тэонімаў): каля 20 імёнаў Бога, каля 33 імёнаў Ісуса Хрыста, 3 імені Духа Святога. Але на самой справе імёнаў Бога значна больш, калі ўлічыць яшчэ такія найменні, як Сын Чалавечы, Настаўнік, Суддзя, Любоў і інш. У задачы нашага даследавання ўваходзіць па магчымасці даць поўны аналіз усіх імёнаў Бога, якія сустракаюцца ў Бібліі на беларускай мове. Але ў дадзеным артыкуле звернем увагу на адно таямнічае імя Бога – т. зв. *тэтраграматон*, або *тэтраграму* (*грэч. tetra – чатыры + gramma – літара*). *Тэтраграматон* (*тэтраграма*) у юдзейскай рэлігійнай традыцыі – чатырохлітарнае імя Бога, якое не

прамаўляецца, не прагаворваецца, лічыцца ўласным імем Бога Старога Запавета ў адрозненне ад іншых яго "тытулаў".

Як ужо адзначалася, Бога называюць рознымі імёнамі, але званае імя – асаблівае, імя, якое было сакрэтам да часоў Майсея. У гэтым імені Бога ўсяго толькі чатыры літары: י (йуд), ה (хей), ו (вав), ה (хей) – ЙХВХ (чыталася і прамаўлялася яно як Яхве). Камусьці יהוה (ЙХВХ) можа здацца вельмі дзіўным імем, якое складаецца толькі з зычных, але справа ў тым, што ў старажытным іўрыце галосныя літары не мелі пазменнага абазначэння да VII ст. н. э. Юдаізм заўсёды прыпісваў вялікую сілу згадванню гэтага імя Бога. Як вядома, яно прамаўлялася ў Іерусалімскім храме толькі першасвятаром у час ахвяравання ў свята Йом Кіпур (Дзень адкуплення) і святарамі, якія даюць святарскае блаславенне. Пазней было забаронена прамаўляць гэтае імя і ў набажэнствах. Менавіта забарона на вымаўленне тэтраграмы прывяла да шырокай практыкі замены імя іншымі словамі-імёнамі. Паводле аднаго з паданняў, гэтая забарона паўстала пасля смерці першасвятара Сымона Праведнага (III ст. да н. э.). У раннім Сярэднявеччы, калі да кансанантнага (пазбаўленага галосных) тэксту Бібліі былі дададзены знакі галосных гукаў для палягчэння правільнага чытання Святога Пісання, слова יהוה было агласавана галоснымі "о" і "а" па прыкладзе імя Аданай ці імя Элахім. Узнікла прачытанне і напісанне такога тыпу, як ЙэХоВаХ – Іегова, якое і па сённяшні дзень выступае сінонімам да імя Яхве: Яхве=Іегова. Але вельмі часта, каб не парушыць трэцюю запаведзь, яно прачытвалася так, як бы гэта было слова Аданай – Гасподзь. Так у хрысціянскай літаратуры з'явілася слова Гасподзь.

У Старым Запавеце Бог Сам адкрывае Сябе Майсею як "אֶהְיֶה אֲשֶׁר אֶהְיֶה", што значыць «Я ёсць Сутны». Сутны – імя Божае, аб'яўленае Майсею, раскрывае Боскае быццё як праўдзіва сутнасную, вечную і нязменную рэальнасць [4]. Ёсць думка, што кожная літара тэтраграматона адпавядае аднаму з чатырох галоўных першасных элементаў, з якіх складаецца свет: Йуд (Y) адпавядае Агню, Хе (H) – Вадзе, Вау (Vau) – Паветру і Хе (H) – Зямлі. Такім чынам, тэтраграматон або імя Іеговы ўяўляе сабой чатыры асноўныя элементы.

Імя Сутны (або Існуючы) – скарочанае прачытанне Боскага пасведчання аб сабе самім: "Я Есмь Той, Хто Я Есмь" (скарочана "Я Есмь", "Сутны"). Імя Сутны адпавядае яўрэйскаму Яхве; абвяшчае дзейсную прысутнасць Бога ў свеце, характарызуе дасканалы вобраз Боскага быцця, паколькі Бог застаецца роўным Сабе, паколькі Ён ёсць заўсёды, паколькі Ён заўсёды Той жа, вечны і нязменны [2].

У яўрэйскай Бібліі паняцце "Бог" пазначаецца таксама трыма словамі-назвамі: Эль, Элаах, Элахім, у грэчаскай – словам Тэас. Прыведзеныя яўрэйскія словы маюць агульны корань, значэнне якога не паддаецца адназначнаму

вытлумачэнню; магчыма, лічаць даследчыкі, яны паходзяць ад кораня -вл- ‘быць наперадзе’, ‘быць моцным’. Форма адзіночнага ліку Эль ужываецца, галоўным чынам, з удакладняльным значэннем – Бог Усявышні, Бог Усемагутны. Было заўважана, што значна часцей, чым Эль, у Бібліі сустракаецца форма множнага ліку Элахім (прыкладна 2500 разоў), якая можа мець наступныя значэнні: боства як агульнае паняцце, нейкі бог, Бог (Адзіны Сутны), багі наогул, пэўныя багі. Слова элахім можа быць старажытнай формай звароту, якая ўжывалася толькі ва ўзнёслай прамове. Такім чынам, імя “Бог” у яўрэйскай мове можа мець значэнне як адзінага, так і множнага ліку; яно ўжываецца не толькі ў дачыненні да Бога Ізраіля. Форма множнага ліку элахім, ужывальная ў значэнні адзіночнага ліку, становіцца спосабам выказвання павагі (параўн.: Мы, Цар ўсяе Русі; Ваша вялікасць, Васпане). У дачыненні да Бога Ізраіля гэта слова абазначае Творцу, чые дзеянні схаваны. Грэчаскае слова Тэас можа абазначаць адзінага існуючага Бога, нейкага іншага бога альбо выказваць агульнае паняцце.

Як бачым, Бог у Старым Запавеце мае ўласнае імя Яхве, якое адлюстроўвалася на пісьме зычнымі літарамі (т. зв. тэтраграмай): Й-Х-В-Х. Як сінонім да яго выступае імя Іегова. Зразумела адно, этымалогія свяшчэннага імя ўяўляе вялікія цяжкасці для тлумачальнікаў і перакладчыкаў: першапачатковы сэнс гэтага імя вызначыць адназначна немагчыма, як лічаць навукоўцы, нават агаласоўка яго складнікаў (4 зычныя літары) з’яўляецца гіпатэтычнай. Пасля вавілонскага палону яўрэі перасталі выкарыстоўваць гэтае імя, бо лічылі яго занадта святым, каб быць вымаўленым грэшнымі людзьмі, яго сталі замяняць на Аданай (Гасподзь). У Старым Запавеце Яхве часцей выкарыстоўваецца ў адносінах Бога з Яго народам, у той час як Аданай выкарыстоўваецца тады, калі Ён меў справу з язычнікамі [3].

Сённяшнім днём у юдаізме выкарыстоўваюцца напісанні “Б-г”, “Гасподзь” у сувязі з тым, што яўрэі наогул пазбягаюць напісання і вымаўлення імя Бога, бо лічыцца, што і ў друкаваным выглядзе, нават у перакладах на іншыя мовы (Б-г, G-d і г. д.), яно валодае святасцю, а такім чынам, можа падвергнуцца абразе пры знішчэнні друкаванага альбо рукапіснага матэрыялу. Пры гэтым не важна, на якой мове яно пішацца, бо святасць імя пры гэтым не змяншаецца, і на любой мове юдзеі павінны пісаць імя Бога праз рысачкі (маюцца на ўвазе мовы, у якіх падтрымліваецца такое напісанне).

Даследуючы паходжанне, вывучаючы семантыку імёнаў Бога, шмат можна даведацца пра самога Бога, атрымаць веды пра яго бясконцую любоў і клопат. Бо ў кожным сваім імені Бог адкрывае сваю вечную сутнасць, грані якой ён адкрывае нам толькі паступова.

**Літаратура**


1. Біблія. Кнігі сьвятога пісаньня Старога і Новага Запавету. Кананічныя. У беларускім перакладзе : пер. В. Сёмухі. – Duncanville (USA) : World wide printing, 2002. – 1534 с.
2. Имена Бога в Библии [Электронный ресурс] // Википедия : свободная энциклопедия. – Режим доступа: https://ru.wikipedia.org/wiki/%D0%98%D0%BC%D0%B5%D0%BD%D0%B0_%D0%91%D0%BE%D0%B3%D0%B0_%D0%B2_%D0%91%D0%B8%D0%B1%D0%BB%D0%B8%D0%B8. – Дата доступа: 14.05.2020.
3. Имя Бога в Библии [Электронный ресурс] // Изучение Библии. – Режим доступа: https://bible-help.ru/imena-boga-skolko-ix/. – Дата доступа: 14.05.2020.
4. Имя Бога в славянских текстах [Электронный рксурс] // Апологетика СИ. – Режым доступа: http://jwapologetica.blogspot.com/2019/11/blog-post_11.html. – Дата доступа: 14.05.2020.